**Падвядзём вынікі.** Асноўныя адзінкі класіфікацыі ландшафтаў Беларусі: класы, тыпы, падтыпы, групы родаў, роды і віды. Да дамінантных у Беларусі адносяцца водна-ледавіковыя і другасна-марэнныя ландшафты, якія сумарна займаюць 35 % тэрыторыі. Тыповыя ландшафты — узгорыста-марэнна-эразійныя, марэнна-зандравыя, азёрна-балотныя, алювіяльныя тэрасаваныя і азёрна-алювіяльныя — займаюць 8–9 % тэрыторыі краіны кожны. Ландшафты, пераўтвораныя гаспадарчай дзейнасцю чалавека, адносяцца да антрапагенных. Найбольш распаўсюджаны ў Беларусі сельскагаспадарчыя і лясныя ландшафты.

***Праверце сябе.*** 1. Якія прыродныя кампаненты з'яўляюцца структурнымі часткамі ландшафтаў? 2. Якая класіфікацыйная адзінка ландшафтаў Беларусі самая буйная, а якая — самая дробная? 3. Якія тыпы антрапагенных ландшафтаў вылучаюцца ў Беларусі?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Прывядзіце прыклады трансфармацыі ландшафту ў выніку змены расліннасці, жывёльнага свету. 2. Растлумачце, чым адрозніваецца вертыкальная будова ландшафту ад гарызантальнай.

***Ад тэорыі да практыкі.*** 1. Падрыхтуйце прэзентацыю пра прыродныя ландшафты вашай мясцовасці. 2. Зрабіце фотаздымкі ландшафтаў, характэрных для вашага раёна.

## § 15. Рэкрэацыйныя рэсурсы

***Успомніце.*** *Якія прыродныя і гісторыка-культурныя аб'екты выкарыстоўваюцца ў мэтах турызму і адпачынку? Дзе і чаму размяшчаюцца міжнародныя турысцкія цэнтры і курорты?*

**1. Віды рэкрэацыйных рэсурсаў.** Да рэкрэацыйных (ад лац. *recreatio* — 'аднаўленне') рэсурсаў адносяцца прыродныя і культурна-гістарычныя комплексы, унікальныя сацыяльна-гаспадарчыя аб'екты, якія выкарыстоўваюцца для арганізацыі адпачынку і аздараўлення людзей, экскурсій і турызму. Садзейнічаюць такому выкарыстанню маляўнічыя ландшафты, лясныя масівы, рэкі і азёры, на базе якіх створаны санаторна-курортныя і аздараўленчыя арганізацыі. Не менш важныя аб'екты культурнай і гістарычнай спадчыны: старажытныя замкі, цэрквы і касцёлы, музеі.

Выкарыстанне рэкрэацыйных рэсурсаў залежыць ад прыродных умоў. Найбольш камфортны клімат для летняга адпачынку ў паўднёвых



Мал. 53. Рэспубліканскі гарналыжны цэнтр «Сілічы»

раёнах Беларусі, а для зімовага — на поўначы і ў цэнтральнай частцы краіны. Важную ролю ў ацэнцы рэкрэацыйных рэсурсаў рэгіёна адыгрывае рэльеф. Узгорысты рэльеф Беларускай грады спрыяе развіццю лыжнага спорту. Тут актыўна развіваюцца лыжныя цэнтры: Сілічы (мал. 53), Лагойск, Раўбічы. Высокім рэкрэацыйным патэнцыялам валодаюць лясы, багатыя на грыбы і ягады.

Аптымальнымі для аздараўленчага адпачынку ў Беларусі лічацца хваёвыя, дубовыя і шыракаліста-хваёвыя лясы. Вялікае значэнне для арганізацыі адпачынку і аздараўлення насельніцтва маюць водныя аб’екты. Азёры, вадасховішчы, рэкі, каналы выкарыстоўваюцца для арганізацыі воднага турызму, які ўключае рыбную лоўлю, сплавы на байдарках, пляжны адпачынак.

Рэкрэацыйныя рэсурсы бываюць курортна-аздараўленчымі, спартыўнымі, экскурсійна-турысцкімі і інш. Часта тэрыторыі выконваюць некалькі функцый, напрыклад, выкарыстоўваюцца для развіцця экскурсійнага і экалагічнага турызму.

**2. Санаторна-курортныя і аздараўленчыя арганізацыі.** Важную ролю ва ўмацаванні здароўя адыгрываюць курорты і зоны адпачынку. У іх межах размяшчаюцца санаторыі, аздараўленчыя лагеры, базы адпачынку і іншыя рэкрэацыйныя аб’екты. У нашай краіне функцыянуе больш за 460 санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацый, у тым ліку 75 санаторыяў, каля 90 баз адпачынку і пансіянатаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 54. Зона адпачынку «Браслаўскія азёры»

У лясных масівах, на маляўнічых берагах рэк, азёр і вадасховішчаў ствараюцца зоны адпачынку рэспубліканскага і мясцовага значэння. На тэрыторыі зон адпачынку рэспубліканскага значэння («Расоны», «Ула» і інш.) адначасова могуць адпачываць да 50 тыс. чалавек. Зонай адпачынку рэспубліканскага значэння з'яўляецца нацыянальны парк «Браслаўскія азёры». Прыгожыя азёры, хваёвыя лясы абумовілі стварэнне тут больш за 10 баз адпачынку і турысцкіх комплексаў (мал. 54). Буйная зона адпачынку «Вілейка» размешчана на пакрытых хваёвымі лясамі берагах Вілейскага вадасховішча.

На карце атласа (с. 26) знайдзіце зоны адпачынку рэспубліканскага значэння.

Вакол гарадоў вылучаюцца тэрыторыі са спрыяльнымі прыроднымі ўмовамі для размяшчэння рэкрэацыйных аб'ектаў. Яны адносяцца да зон адпачынку мясцовага значэння. У краіне вылучаецца звыш 140 зон адпачынку мясцовага значэння. У прыгараднай зоне Мінска, на берагах вадасховішчаў Заслаўскае, Крыніца, Дразды размешчана зона адпачынку «Мінскае мора».

Найбагацейшыя на рэкрэацыйныя рэсурсы тэрыторыі вылучаюцца ў якасці курортных зон, курортаў, лячэбна-аздараўленчых мясцовасцей.

Найбольш вядомай у краіне і за яе межамі з'яўляецца курортная зона Нарачанскага рэгіёна, якая ўключае каля 20 аздараўленчых установ. Вакол возера Нарач размяшчаюцца санаторыі, дамы адпачынку, гасцінічныя комплексы (мал. 55).



Мал. 55. Курорт «Нарач»

У краіне функцыянуюць чатыры курорты рэспубліканскага і сем — мясцовага значэння, створаныя для арганізацыі адпачынку і лячэння.

У межах курортаў Беларусі дзейнічае больш за 100 санаторыяў, баз адпачынку і аздараўленчых цэнтраў. Найстарэйшы ў краіне кліматабальнеалагічны курорт «Ждановічы» ўключае некалькі санаторыяў («Юнацтва», «Крыніца», «Пралеска» і інш.), дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр «Ждановічы» і інш. Некаторыя санаторыі размешчаны па-за курортамі: «Іслач», «Белая Вежа», «Азёрны», «Баравое» і інш.

На карце атласа (с. 69) знайдзіце курорты рэспубліканскага і мясцовага значэння.

**3. Экскурсійна-турысцкія рэсурсы.** Да экскурсійна-турысцкіх рэсурсаў пазнавальнага характару адносяцца помнікі гісторыі і культуры.

У Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей уключаны 5,7 тыс. аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Сярод іх помнікі ваенна-абарончай, культавай, прамысловай і жыллёвай архітэктуры, помнікі і памятныя мясціны, звязаныя з імёнамі вядомых людзей, гістарычнымі падзеямі, курганы і гарадзішчы, старажытныя сядзібна-паркавыя комплексы.

Найбольш вядомыя помнікі — замкавы комплекс «Мір» і Нясвіжскі палацава-паркавы ансамбль, уключаныя ЮНЕСКА ў Спіс Сусветнай спадчыны (мал. 56). Да аб'ектаў Сусветнай спадчыны ў Беларусі адносяцца ў тым ліку пункты Дугі Струвэ і нацыянальны парк «Белавежская пушча», а таксама шэсць аб'ектаў нематэрыяльнай спадчыны.

Знайдзіце на карце атласа (с. 26) аб'екты матэрыяльнай і нематэрыяльнай Сусветнай спадчыны.



Мал. 56. Нясвіжскі палацава-паркавы ансамбль



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 57. Мемарыяльны комплекс «Хатынь»

Яшчэ 12 аб'ектаў маюць сусветнае значэнне: Камянецкая вежа, Спаса-Праабражэнская царква і Сафійскі сабор у Полацку, Аўгустоўскі канал і інш. Шмат у краіне помнікаў, мемарыяльных комплексаў, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Найбольш вядомыя з іх «Брэсцкая крэпасць-герой», «Хатынь» (мал. 57) і інш. Матэрыяльныя аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны нераўнамерна размяркоўваюцца па тэрыторыі Беларусі. У 13 самых «багатых» адміністрацыйных раёнах іх колькасць перавышае 35/1000 км$^2$.

Знайдзіце на карце атласа (с. 26) гэтыя раёны і растлумачце, чаму ў іх шмат аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны.

Вялікая колькасць помнікаў гісторыі і культуры, маляўнічасць ландшафтаў фарміруюць высокі рэкрэацыйны патэнцыял Беларусі. На базе гісторыка-культурных аб'ектаў фарміруюцца цэнтры турызму і адпачынку. Найбольш значныя тры шматфункцыянальныя цэнтры міжнароднага значэння: Мінск, Гродна і Полацк. Акрамя іх вылучаюцца 16 цэнтраў нацыянальнага значэння, у тым ліку два цэнтры рэлігійнага турызму і два курортна-аздараўленчыя цэнтры.

Знайдзіце на карце атласа (с. 26) цэнтры турызму і адпачынку.

Каардынацыяй турысцкай дзейнасці ў краіне займаецца Міністэрства спорту і турызму. Турысцкія прадпрыемствы арганізуюць турысцка-экскурсійныя маршруты па цікавых у прыродных або гісторыка-культурных адносінах мясцінах краіны. З захаду на ўсход (ад Брэста да Оршы) Беларусь перасякаюць аўтамабільная дарога і чыгунка. Гэтыя магістралі вобразна называюць «беларускім экватарам». У іх зоне знаходзяцца гарады і пасёлкі з гістарычнымі помнікамі (Косава, Ружаны, Мір, Нясвіж, Заслаўе, Барысаў і інш.). Найбольш вядомымі турысцка-экскурсійнымі маршрутамі з'яўляюцца: Мінск — Мір — Нясвіж, Мінск — Слонім — Жыровічы, Мінск — Навагрудак — Бярозаўка — Ліда, Мінск — Полацк, Мінск — Хатынь, Брэст — Каменюкі (у Белавежскую пушчу) і інш.

**4. Перспектывы выкарыстання рэкрэацыйных рэсурсаў.** Рэкрэацыйныя рэсурсы Беларусі выкарыстоўваюцца не ў поўнай меры. Асабліва гэта датычыцца арганізацыі міжнароднага турызму.

У цяперашні час у Беларусі прынята Дзяржаўная праграма развіцця турызму. Дзякуючы гэтаму дастаткова паспяхова развіваецца ўязны турызм. У 2023 г. Беларусь наведалі больш за 233 тыс. замежных турыстаў, у асноўным з краін СНД. Турысцка-рэкрэацыйныя аб'екты наведалі больш за 1,5 млн грамадзян Беларусі.

У краіне развіта турысцкая інфраструктура, якая ўключае каля 600 гасцініц, турысцка-гасцінічных комплексаў і матэляў. Штогод каля 1 млн чалавек карыстаюцца паслугамі санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацый. Сярод іх вялікая колькасць замежных турыстаў, асабліва з Расійскай Федэрацыі.

Музеі, замкі, помнікі дойлідства, мемарыяльныя комплексы, прыродныя аб'екты прываблiваюць замежных турыстаў. Беларусь можа стаць адным з цэнтраў міжнароднага турызму ва Усходняй Еўропе. Што неабходна зрабіць для больш паспяховага выкарыстання турысцкага патэнцыялу краіны?

Клопат дзяржавы аб развіцці матэрыяльнай базы аховы здароўя, высокі ўзровень медперсаналу садзейнічаюць з'яўленню новага кірунку турызму — медыцынскага.

Вялікую папулярнасць набывае спартыўны турызм. У Беларусі актыўна развіваецца інфраструктура спартыўных збудаванняў, праводзяцца спартыўныя спаборніцтвы рознага ўзроўню: чэмпіянаты свету і Еўропы па акадэмічным веславанні, хакеі, фігурным катанні і біятлоне і інш. Напрыклад, у 2019 г. у Беларусі прайшлі II Еўрапейскія гульні.

У апошнія гады ў Беларусі развіваецца аграэкатурызм (сельскі турызм). Паспяхова функцыянуе больш за 1,3 тыс. аграэкасядзіб, якія прадстаўлены ва ўсіх раёнах краіны. Асноўнымі цэнтрамі развіцця экалагічнага турызму з'яўляюцца прыродаахоўныя тэрыторыі. У межах нацыянальных паркаў і заказнікаў распрацаваны пешыя, веласіпедныя і водныя экалагічныя маршруты. У лясгасах арганізуецца паляванне для айчынных і замежных турыстаў, створаны вальеры. Уздоўж натуральных зялёных калідораў, далін рэк, гістарычных гандлёвых шляхоў і старых чыгунак ствараюцца зялёныя маршруты.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Падвядзём вынікі.** Беларусь добра забяспечана рэкрэацыйнымі рэсурсамі: курортнымі, аздараўленчымі, спартыўнымі і экскурсійна-турысцкімі. У краіне вылучаюцца зоны адпачынку рэспубліканскага і мясцовага значэння, больш за 460 санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацый, адна курортная зона і 11 курортаў рэспубліканскага і мясцовага значэння.

***Праверце сябе.*** 1. На якія віды падзяляюцца рэкрэацыйныя рэсурсы? 2. Дзе размешчаны зоны адпачынку і курорты ў межах Беларусі? 3. У якім рэгіёне Беларусі і чаму знаходзіцца найбольшая колькасць зон адпачынку рэспубліканскага значэння?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Якія турысцкія маршруты карыстаюцца найбольшым попытам у Беларусі і чаму? 2. Якія помнікі гісторыі і архітэктуры размешчаны ў рэгіёне, у якім вы жывяце? З якімі гістарычнымі падзеямі яны звязаныя?

***Ад тэорыі да практыкі.*** 1. Вызначце перспектывы выкарыстання рэкрэацыйных рэсурсаў у вашым раёне. 2. Прапануйце турысцкія маршруты па вашым рэгіёне для замежных гасцей.

## § 16. Геаэкалагічныя праблемы

***Успомніце.*** *Чаму ўздзеянне на навакольнае асяроддзе ў апошнія гады ўзмацняецца? Пра якія глабальныя геаэкалагічныя праблемы і катастрофы вы чулі са СМІ?*

**1. Сутнасць геаэкалагічных праблем.** Выкарыстанне прыродных рэсурсаў можа прыводзіць да геаэкалагічных праблем. Напрыклад, здабыча карысных выкапняў можа прывесці да забруджвання глеб, вод, паветра і г. д. Рацыянальнае прыродакарыстанне забяспечвае найбольш поўнае выкарыстанне прыродна-рэсурснага патэнцыялу. У адпаведнасці з Нацыянальнай стратэгіяй устойлівага развіцця Беларусі захаванне навакольнага асяроддзя з’яўляецца важным паказчыкам рацыянальнага прыродакарыстання. На сучасным этапе будаўніцтва прамысловых прадпрыемстваў, дарог, асваенне карысных выкапняў немагчыма без экалагічнай экспертызы аб’екта. У залежнасці ад маштабу ўздзеяння геаэкалагічныя праблемы могуць быць глабальнымі, рэгіянальнымі ці лакальнымі.

У Беларусі да рэгіянальных геаэкалагічных праблем адносяцца наступныя: радыеактыўнае забруджанне тэрыторыі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС, дэградацыя ландшафтаў Палесся ў выніку асушэння, дэградацыя навакольнага асяроддзя ў Салігорскім горнапрамысловым раёне. Для вырашэння гэтых праблем неабходна правядзенне комплексу спецыяльных мерапрыемстваў.